# Працэдура разгляду судовых спраў на вальных соймах Рэчы Паспалітай у канцы XVI — пачатку XVII ст.

*Валадковіч В. А., асп. РІВШ,*
*навук. кір. дац. Любы А. У., канд. гіст. навук*

У сістэме судовых органаў Рэчы Паспалітай (далей — РП) соймавы суд займаў месца вышэйшай агульнадзяржаўнай судовай установы, якая разглядала найважнейшыя крымінальныя і цывільныя справы. Прыгавор соймавага суда лічыўся канчатковым і не падлягаў апеляцыі.

Соймавы суд пачынае фарміравацца як частка велікакняжацкага суда, які разглядаў справы ў час сойма. З самага пачатку ўзнікнення соймаў вялікі князь (гаспадар) разглядаў на іх толькі найбольш значныя судовыя справы. Менш значныя справы разглядаў велікакняжацкі суд. Аднак перагружанасць велікакняжацкага суда значнай колькасцю спраў прыводзіла да зацягвання працэсу судаводства і пастаянных пераносаў пасяджэнняў [1, № 23, 27, 52; 2, с. 297, 301, 304]. Немагчымасць своечасовага ажыццяўлення судаводства вымушала вялікага князя выносіць частку спраў на разгляд сойма, дзе прысутнічала і рада — абавязковы ўдзельнік велікакняжацкага суда.

Склад і працэдура правядзення соймавага суда змяняліся на працягу акрэсленага перыяду. Да 1588 г. справы разглядалі кароль і сенат (фактычна паны радныя). Канстытуцыя Кракаўскага сойма 1588 г. і Статут 1588 г. змяняюць такую практыку, уводзячы ў склад суда восем дэпутатаў сойма [3, № 1207; 4, с. 555, 583]. Гэтае палажэнне карэнным чынам змяніла расклад сіл у соймавым судзе. Кароль, які раней быў галоўным чыннікам на судзе, цяпер стаў проста яго арганізатарам, ад імя якога выдаваліся позвы: «з рамени и зверхности нашое господарской росказуемъ, абы еси передъ нами… на сойме близко пришломъ… очевисте и завите сталъ» [5, № 128]. Кіраўніком становіцца маршалак каронны, які і прызначае восем дэпутатаў. Склад увогуле мог змяняцца ў залежнасці ад справы. Пры разглядзе пытання аб абразе маястату ў склад суда ўваходзілі толькі сенатары і восем дэпутатаў без удзелу караля: «…абы на тыя справы на сойме гэтым, без нашай прысутнасці галасавалі, для чаго такі суд з кола пасольскага дэпутацкага павінна быць восем асоб» [3, № 1207]. Усе дэпутаты былі роўнымі ў сваіх прэрагатывах [3, № 1212]. Удзел пасольскіх дэпутутаў у соймавых судах садзейнічаў кантролю за недапушчэннем парушэння шляхецкіх вольнасцей і абмежаванню ўлады караля і сената. Акрамя вышэйназваных асоб, у склад суда ўваходзілі рэфендарыі (дапаможцы канцлера) каронныя і літоўскія і пісары земскія. Пісары вялі рэестры, рэфендарыі дакладалі справы, падпісвалі прыгаворы, сачылі за чарговасцю разгляду спраў.

Звычайна суд праводзіўся раз на два гады, пачынаўся з адкрыцця сойма і працягваўся да заканчэння пасяджэнняў [6, с. 124]. Непасрэдна для ВКЛ Канстытуцыя 1589 г. вызначыла для соймавага суда адзін дзень на тыдзень (аўторак) у час працы сойма для разгляду спраў [7, № 1285]. Была выпрацавана своесаблівая працэдура разгляду судовых спраў на сойме. Першапачаткова пры разглядзе справы бакі выступалі са сваімі прамовамі перад каралём [8, с. 293–295]. Часам перад судом проста агучваліся падрабязнасці справы [8, с. 598, 599]. Пасля выслухоўвання бакоў ці іх абаронцаў пытанне абмяркоўвалі сенат і кароль: «…кароль потым паклікаў да сябе сенатараў і абмяркоўваў з імі гэтую справу» [8, с. 269]. Пры гэтым паміж сенатарамі і каралём часта не было згоды і ўзнікалі спрэчныя моманты [8, с. 295]. Пасля прыняцця рашэння кароль праз маршалка аб'яўляў аб сваім прыгаворы: «…кароль абвясціў праз маршалка кароннага такі прыгавор» [8, с. 295]. Затым справа перадавалася на абмеркаванне паслам, якія разглядалі яе, а потым паведамлялі аб сваім рашэнні сенату, пасля чаго кароль і сенатары пагаджаліся з такім рашэннем ці імкнуліся пераканаць паслоў у іншым: «паслы пачалі абмяркоўваць гэтую справу» [8, с. 516].

Нярэдка паслы ўмешваліся ў справы сенатараў і прымушалі іх абмяркоўваць пытанні [8, с. 108]. Вядомую цяжкасць складаў пошук згоды паміж пасламі: «…прыгавора па гэтых меркаваннях нельга было скласці, бо паслы былі нязгодныя між сабой» [8, с. 249]. Рашэнні павінны былі прымацца большасцю галасоў, аднак кароль незаўсёды прытрымліваўся правіла, што выклікала незадаволенасць [8, с. 429, 506]. Прычым праблема адсутнасці згоды была настолькі вялікай, што часам немагчыма было прыняць рашэнне і шэраг паслоў вымушаны былі дзеля вырашэння справы галасаваць за супрацьлеглае меркаванне [8, с. 346]. Часам асобы, якія імкнуліся да вынясення сваіх спраў на соймавы суд, прасілі паслоў замовіць слова пра іх перад каралём: «…каб гаспадары паслы замовілі ў яго вялікасці» [8, с. 157].

Пры асабліва цяжкіх і значных пытаннях абедзве палаты аб'ядноўваліся ў адну, спачатку выказвалі меркаванне сенатары, а затым — паслы. Абмеркаванні паслоў павінны былі быць публічнымі, аднак гэтага правіла прытрымліваліся далёка не заўсёды: «…кароль быў на таемным пасяджэнні» [8, с. 223]. Пры прыняцці рашэння кароль незаўсёды прытрымліваўся меркаванняў большасці, што выклікала незадаволенасць. Калі спраў было шмат ці яны былі складанымі, то кароль мог перанесці справу на іншы дзень: «…справы адкладзены да заўтра» [3, с. 349]. Прыгавор суда лічыўся канчатковым. Аднак калі на соймавым судзе гаспадар адсутнічаў ці яго пункт гледжання разыходзіўся з думкай большасці, то за гаспадаром захоўвалася права памілавання.

Такім чынам, на працягу XVI ст. афармляецца інстытут соймавага суда як вышэйшай судовай установы Вялікага Княства Літоўскага. Аднак з другой паловы XVII ст. у сувязі з ростам крызісу шляхецкага парламентарыз-

му і пастаянных зрываў сойма суд трапіў у заняпад і ў большасці выпадкаў не мог выносіць адпаведныя прысуды.

**Літаратура**

1. Литовская метрика. Отдел 1, ч. 2 : Книги судных дел, т. 1 // РИБ. Т. 20 / под ред. П. А. Гильтебрандта. — СПб. : Сенатская тип., 1903. — 290 с.

2. Малиновский, И. А. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского / И. А. Малиновский. — Томск : Паровая типолитография П. И. Макушина, 1901. — 160 с.

3. Volumina Legum : przedruk zbioru praw staraniem XX pijaryw w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782 : leges, statuta, constitutiones et privilegia regni Poloniae, magni ducatus Lithuaniae, omniumque provinciarum annexarum, a commitiis vislicle anno 1347 celebratis usque ad ultima regni comotia / J. Ohryzko. — Petersburg : 1859. — T. 2 : ab anno 1550 ad annum 1609. — 482 s.

4. Статут Великого княжества Литовского 1588 года // Вялікае княства Літоўскае : ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / склад. В. С. Пазднякоў ; рэдкал. : Т. У. Бялова (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2010. — Т. 3 : Дадатак. — С. 550–689.

5. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией : в 5 т. — СПб. : Археографическая комиссия, 1851. — Т. 4 : 1588–1632. — 529 с.

6. Кареев, Н. И. Исторический очерк Польского сейма / Н. И. Кареев. — М. : Тип. А. И. Мамонтова, 1888. — 162 с.

7. Метрыка Вялікага княства Літоўскага : Кніга запісаў № 30 (копія канца XVI ст.) / падрыхт. В. С. Мянжынскі. — Мінск : Беларус. навука, 2008. — 385 с.

8. Дневник Люблинского сейма 1569 года. Соединение Великого княжества Литовского с Королевством Польским / переведен на русский язык и приготовлен к изданию М. О. Кояловичем. — СПб. : Печатня В. Головина, 1869. — 786 с.

# Давыдов Аким Харлампович — лидер Гомельского отдела Союза русского народа

*Гавриков А. В., студ. IV к. ГГУ им. Ф. Скорины,*
*науч. рук. ст. преп. Бровкин Е. А.*

Актуальность исследования проблемы правомонархического движения в Беларуси в начале XX в. заключается в том, что в последнее время наблюдается повышенный интерес к общественно-политической жизни нашего края. Он обусловлен тем, что многие аспекты жизнедеятельности лидеров правомонархических организаций остаются практически не изученными. Одним из них является деятельность лидера Гомельского филиала Союза русского народа (СРН).